навыкаў педагагічных зносін. Асноўнымі відамі заняткаў сталі экскурсіі ў музеі, наведванне ўстаноў, звязаных з аховай і захаваннем гісторычна-культурнай спадчыны, з далейшым абмеркаваннем усяго ўбачанага і пачутага. Менавіта тут выяўляецца магчымасць фарміравання як калектыўнага, так і асабістага мыслення, светапогляду, творчага падыходу і аптымізацыі ўсяго навучальнага працэсу. Разнастайнасць заданняў для напісання рэферата па выбранай студэнтам тэме стымулюе раскрыццё асобы студэнта, дае магчымасць выкарыстаць набытыя ўменні і навыкі, убачыць перспектыву іх прымянення у сваёй будучай прафесійнай дзейнасці па вырашэнні пытанняў бізнесу і прадпрымальніцтва ў сферы культуры. Творчая садружнасць студэнтаў з вядучымі фірмамі Беларусі (напрыклад, Дайнова, Лада-ОМС і інш.) дае падставы выказаць шчырую ўпэўненасць, што пакуль будзе беларускі народ, будзе не толькі беларуская культура, але і беларускі бізнес, беларускія адраджэнцы-прадпрымальнікі з ліку мэнеджэраў сацыякультурнай сферы, падрыхтаваных у Беларускім універсітэце культуры.

Варашылаў А.К.,
дацэнт

## СІСТЭМНАСЦЬ ЯК ЯКАСЦЬ ПРАФЕСІЙНАЙ СВЯДОМАСЦІ СТУДЭНТАЎ

Аналіз прафесійнай свядомасці сацыякультурных работнікаў сведчыць аб яе няпоўным, недастатковым фарміраванні ў перыяд навучання ва універсітэце культуры. Прычын тут многа: а) адсутнасць агульнай канцэпцыі ў падрыхтоўцы спецыялістаў; б) неразуменне кожным асобным выкладчыкам свайго ўкладу ў выхаванне сацыякультурнага работніка; в) адсутнасць сістэмных сувязей паміж асобнымі «часткамі» ведаў і інш. Таму асноўная праблема заключаецца ў наладжванні ўзаемадзеяння паміж выкладчыкамі, якія даюць студэнтам неабходныя веды. Часта аб'ект вывучэння бывае адзін, а падыходы да яго тых ці іншых навук розныя. Студэнту можа здавацца, што ен паведамляемае выкладчыкам ад кагосьці ўжо чуў. Гэта прыводзіць да скрытай ці яўнай незадаволенасці студэнтаў, а выкладчыкі дарэмна шукаюць дубліруючыя дысцыпліны. Зыходзячы з вышэйсказанага, трэба звярнуць пільную ўвагу на вырашэнне дадзенай праблемы. Метадычнымі задачамі ў гэтым накірунку з'яўляюцца наступныя:

1) вызначэнне выкладчыкам сваёй «часткі матэрыялу», якая неабходна студэнту ў яго практычнай дзейнасці;

2) высвятленне спецыфікі аб'ему ведаў і іх сувязей з іншымі дысцыплінамі;

3) «убудоўванне» гэтага аб'ему ў цэласную прафесійную свядомасць студэнта.

Калі гэтыя задачы будуць выконвацца, тады ў студэнтаў будзе фарміравацца цэласная прафесійная свядомасць, якая адпавядае прынцыпу неабходнасці і дастатковасці атрыманых ведаў.

Калачова І.І.,
аспірантка

## МЕСЦА БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ САЦЫЯЛЬНЫХ ПЕДАГОГАЎ

Важнейшымі асаблівасцямі ў падрыхтоўцы сацыяльных педагогаў, на наш погляд, з'яўляюцца фарміраванне ў іх ведаў па беларускай народнай педагогіцы (этнапедагогіцы) і ўменне выкарыстоўваць гэтыя веды ў практычнай дзейнасці.

У наш час народная педагогіка можа дапамагчы сацыяльнаму педагогу зарыентавацца на прыклады гуманных шляхоў фарміравання лепшых чалавечых якасцей. Не валодаць асноўнымі прыёмамі і метадамі этнапедагогікі - значыць падсякаць корань педагагічнай навукі, бо народная і навуковая педагогіка - адно дрэва выхавання чалавека. У курсе беларускай народнай педагогікі могуць вывучацца наступныя пытанні: гісторыя народнай педагогікі; асноўныя сродкі народнай педагогікі; спосабы і прыёмы выхавання асобы; пытанні працоўнага, разумовага, маральнага, рэлігійнага, эстэтычнага, патрыятычнага, фізічнага выхавання; сямейныя этнапедагагічныя традыцыі беларусаў і інш.

Асноўныя віды заняткаў - лекцыі, семінары, практыкумы, самастойная праца.

Змест лекцый павінен быць насычаны ідэямі, распрацаванымі вядомымі беларускімі навукоўцамі Д.Г.Булгакоўскім, М.В.Доўнар-Запольскім, Я.Ф.Карскім і інш., а таксама ідэямі прац сучасных навукоўцаў - этнографаў, фалькларыстаў, філолагаў.

Семінары павінны адлюстроўваць асноўныя ідэі лекцыйнага матэрыялу, на іх абавязковым з'яўляецца выкарыстанне дадатковай літаратуры, наглядных сродкаў. Формы семінарскіх заняткаў могуць быць наступныя: круглыя сталы, дыскусіі, дзелавыя гульні, пазнавальныя гульні і інш.

Практыкумы павінны адпавядаць мэтам, якія распрацаваны ў лекцыях і ў час семінараў; абавязковай адметнасцю практыкумаў павінен быць улік асаблівасцей соцыуму. Адным з аспектаў практычнай працы са студэнтамі можа быць распрацоўка, напісанне і пастаноўка сцэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нарысў адпаведнай тэматыкі. Добра было б, каб студэнты выходзілі за межы аўдыторыі: сустракаліся з творчымі людзьмі, удзельнічалі ў масавых мерапрыемствах, звязаных з беларускай народнай спадчынай.

Самастойная праца і індывідуальныя заняткі студэнтаў павінны замацоўваць набытыя веды на іншых відах заняткаў.

Сацыяльнаму педагогу патрэбны таксама веды па сямейнай этнапедагогіцы. Народная педагогіка можа даць нам шмат метадаў і спосабаў «лячэння» сучаснай сям'і, напрыклад праз гульню, песню, танец, цацку і інш. Патрэбна выкарыстаць гэты шанс для паляпшэння сямейных стасункаў, узаемаадносін членаў сям'і, умацавання бацькоўскага аўтарытэту і ролі асобы дзіцяці.

На наш погляд, мэтазгодна ў вучэбныя праграмы па падрыхтоўцы сацыяльных педагогаў уключыць наступныя прадметы: «Этнапедагогіка», «Сямейна-бытавая культура», «Методыка арганізацыі і правядзення сямейнага адпачынку» і інш.

Самерсава Н.У.,
аспірантка

## МЕСЦА СПЕЦКУРСА «САЦЫЯЛЬНАЯ ЭКАЛОГІЯ» Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ САЦЫЯЛЬНАГА ПЕДАГОГА

У сістэме падрыхтоўкі будучага сацыяльнага педагога важным і неабходным звяном з'яўляецца ўключэнне ў агульную навучальную праграму студэнтаў спецкурса па сацыяльнай экалогіі, якая вывучае месца чалавека ў экасістэме, узаемны ўплыў чалавека і навакольнага асяроддзя і перамены, што з'яўляюцца вынікам гэтага ўплыву.

Будучы сацыяльны педагог павінен больш глыбока пазнаць аб'ектыўную неабходнасць аптымізацыі ўзаемадзеяння грамадства і прыроды і падрыхтавацца да працы ў гэтай галіне.

Для вырашэння існуючых сацыяльна-экалагічных праблем неабходна мець стройную сістэму навуковых ведаў аб спецыфіцы і заканамернасцях экалагічнага выхавання, аб сродках, метадах, тэхналогіях аказання дапамогі ўсім, хто мае ў гэтым патрэбу, на аснове інтэграваных ведаў аб чалавеку і навакольным асяроддзі.

Але пры існуючым змесце адукацыі падрыхтоўка будучага сацыяльнага педагога зводзіцца да засваення толькі некаторых элементаў экалагічнай работы. Як паказала апытанне, студэнты не бачаць, якая існуе магчымасць пераносу атрыманых уменняў і ведаў ў рэальную сацыяльна-педагагічную дзейнасць. У будучых спецыялістаў не распрацаваны псіхалагічныя ўстаноўкі, перакананні ў значнасці сацыяльна-экалагічных праблем, яны не ўмеюць выкарыстоўваць спецыяльны навуковы матэрыял у сістэме разнастайных сітуацый, звязаных з жыццём з будучай сацыяльна-педагагічнай практыкай.

Такім чынам, адной з прычын, якія зніжаюць эфектыўнасць падрыхтоўкі педагога, з'яўляецца недастатковая распрацаванасць навуковых асноў экалагічнай адукацыі і выхавання ў вышэйшай школе.

Праграма спецкурса «Сацыяльная экалогія» дае магчымасць шырокага азнаямлення будучых сацыяльных педагогаў з асноўнымі ідэямі і прынцыпамі сацыяльнай экалогіі; раскрыцця заканамернасцей ўздзеяння грамадства на навакольнае асяроддзе і тых змен у ім, якія аказваюць уплыў на здароўе чалавека, яго псіхаэмацыянальную сферу; знаходжання шляхоў, сродкаў і метадаў экалагічнай адаптацыі людзей.

Каралькоў М.А., дацэнт

## АБ УДАСКАНАЛЕННІ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ ФАКУЛЬТЭТА МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

Факультэт мастацкай творчасці быў створаны на базе факультэта КПР у 1986 г. Гэта быў крок наперад не толькі ў развіцці мастацкай культуры ў нашым інстытуце (зараз універсітэце), але і наогул у развіцці мастацтва Беларусі, адраджэнні беларускай мастацкай нацыянальнай культуры, у паляпшэнні прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Ужо на першым годзе свайго існавання факультэт адразу абазначыў свой новы накірунак - тэрмінова павысіць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. Але каб гэтага дасягнуць, неабходна было змяніць псіхалогію не толькі студэнтаў, але і выкладчыкаў. І гэта было зроблена дзякуючы самаадданай працы загадчыкаў кафедраў і выкладчыкаў факультэта.

Пераход на новы 5-гадовы план навучання (раней было 4 гады) даў магчымасць павялічыць колькасць спецыяльных дысцыплін. На ўсіх выпускаючых кафедрах факультэта з'явіліся выдатныя калектывы, у якіх шліфавалася майстэрства студэнтаў («Валачобнікі», «Спадчына», «Мара», «Стыг-бэнд» і інш.).

Вялікую ролю ў павышэнні прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў адыграла тое, што Міністэрства культуры дазволіла лепшым нашым выпускнікам прысвойваць дадатковую кваліфікацыю - выкладчык спецдысцыплін. Гэта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ